# ЗНАЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ ЦЁТКІ

*В.Ч. ХВАЙНІЦКАЯ*

# Цётка

– адна з самых вядомых беларускіх паэтак мяжы XIX – XX стагоддзяў.

Яна падтрымала сфармуляваную Францішкам Багушэвічам канцэпцыю нацыянальнага адраджэння, пашырыла яго эстэтыку і разам з іншымі аўтарамі-сучаснікамі змагалася за беларускую дзяржаўную ідэю.

# Цётка

прынесла ў беларускую паэзію моцную стыхію лірызму, пачуццёвасці, якая абапіралася на вобразы і мастацкія прыёмы фальклору.

# Героі і гераіні Цёткі

**траплялі ў сітуацыі на мяжы жыцця і смерці і ў такіх абставінах асэнсоўвалі сваё жыццё.**

**Праз некалькі дзесяцігоддзяў творы такога тыпу будуць называць экзістэнцыяльнымі.**

# Цётка

**– адна з пачынальніц жанру дарожнага эсэ (падарожныя нататкі) у беларускай літаратуры XX стагоддзя .**

**Ва «Успамінах з паездкі ў Фінляндыю» пісьменніца ўзняла актуальную тэму – *Беларусь у свеце і свет для Беларусі.***

# Цётка

стварыла ўзоры:

- сацыяльна-бытавога,
- алегарычнага,
- псіхалагічнага,
- сатырычнага апавяданняў.

Выкарыстоўвала пры гэтым прыёмы сінтэтычнага пісьма:

- рэальны сюжэт часта меў сімволіка-алегарычны план;
- містычныя перажыванні ўпляталіся ў рэалістычныя падзеі.

# Цётка

– аўтар першых беларускіх чытанак, заклала асновы методыкі выкладання, падрыхтаваўшы «Першае чытанне для дзетак беларусаў», «Гасцінец для малых дзяцей», «Беларускі лемантар, або Першая навука чытання» (магчымы аўтар).

# Цётка

– удзельніца працэсу стварэння непадцэнзурнага, а потым і легальнага беларускага перыядычнага друку.

# Педагагічна-асветніцкая спадычына Цёткі

**грунтуецца на ідэях фарміравання нацыянальна свядомай асобы, на законах хрысціянскай маралі і маральна-этычных напрацоўках усяго народа.**

**Вершы, празаічныя творы, творы для дзяцей, публіцыстыка ўвабралі ў сябе ўсё лепшае з педагагічна-выхаваўчай мудрасці беларускага народа.**

## Як пачынальніца беларускай народнай асветніцкай справы Цётка

не толькі стварыла першы беларускі падручнік, але і заклала асновы новай беларускай асветнай методыкі.

Асабліва важнае значэнне для развіцця беларускай нацыянальна-выхаваўчай ідэі мае публіцыстыка, якая стала ўзорам асветна-педагагічных даследаванняў першай чвэрці XX ст.

# Уплыў творчасці і асобы Цёткі на беларускае нацыянальнае адраджэнне

**Пісьменніца сапраўды здзейсніла подзвіг вернасці Радзіме ў надзвычай складаных умовах, бо менавіта яна стварала і праводзіла ў жыццё нацыянальныя праекты, звязаныя з беларускай народнай асветай і ідэяй самаідэнтыфікацыі, самадастаковасці беларусаў**

# Літаратурныя крыніцы


1. **Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. / А. М. Макарэвіч і інш. ; пад агул. рэд. А. М. Макарэвіч, М. Б. Яфімавай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – С. 105-132.**
2. **https://be.wikipedia.org/wiki/Алаіза_Пашкевіч**